# Канцэпцыі паходжання беларускай народнасці







**Народнасць - гістарычная супольнасць людзей, што ўзнікае з асобных плямёнаў падчас распаду родава-племянных адносінаў, да ўзнікнення шчыльных эканамічных сувязяў і адзінай эканомікі, якая характарызуецца адзінствам мовы, тэрыторыі, звычаяў і культуры.**





# Канцэпцыі

- Шавіністычныя (вялікаруская і вялікапольская) – XIX ст.
- Крыўская – пачатак XX ст.
- Крыўска-Дрыгавіцка-Радзіміцкая – пачатак XX ст.
- Фінская – 1980-1990-ыя гг.
- Старажытнарускай народнасці – мяжа XIX – XX стст., 1940-1950-ыя гг.
- Балцкая – 1970-ыя гг.

# Шавіністычныя канцэпцыі




**Беларусы – частка расійскага/польскага народу, сапсаваная польскім/расійскім уплывам**

**Сярэдзіна XIX ст. – тэорыя “Трыадзінай рускай народнасці”**

# Крыўска-дрыгавіцка-радзіміцкая канцэпцыя

Распрацавана ў пачатку XX ст., адзін з асноўных стваральнікаў – Мітрафан Віктаравіч Доўнар-Запольскі (1867 – 1934).

У аснове канцэпцыі ляжаць погляды беларусазнаўцаў мяжы XIX - XX ст., у тым ліку “заходнерусістаў”.

Беларусы утварыліся на аснове старажытных плямёнаў крывічоў, дрыгавічоў і радзімічаў.



# Крыўская канцэпцыя

Створана на пачатку XX ст. Вацлавам Ластоўскім (1883 – 1938).

- Беларусы – нашчадкі старажытных крывічоў;
- Назва “беларусы” – няпраўдзівая, прынесеная расейцамі;
- Народ варта называць крывічамі, а краіну – Крыўяй, Крывіяй;
- Паняцці “беларускі” і “крыўскі” ў крывіцкім дыскурсе нярэдка разглядаюцца як сінанімічныя.






Сёння крыўская канцэпцыя зліваецца з **балцкай** тэорыяй этнагенэзу і з’яўляецца адной з асноўных у беларускай навуцы.



Акрамя навуковага, крыўская канцэпцыя мае філасофска-культурны змест

# Канцэпцыя Старажытнарускай народнасці




- Карані канцэпцыі – у тэорыі “трыадзінай рускай народнасці”.
- У завершаным выглядзе афармілася ў познія сталінскія часы, была падтрымана асабіста Сталіным.
- Змест:
- У IX-XII ст. існавала адзіная Старажытнаруская дзяржава
- У рамках яе, на аснове славянскіх плямёнаў, ўтварылася адзіная Старажытнаруская народнасць
- Пасля распаду Старажытнарускай дзяржавы распадаецца і народнасць, даючы пачатак тром “брацкім” народнасцям – вялікарускай, маларускай (украінскай) і беларускай.

# Балцкая канцэпцыя

Створана савецкім археолагам Валянцінам Васільевічам Сядовым (1924 – 2004), падтрымліваецца шматлікімі даследчыкамі, у тым ліку беларускімі (Г.В. Штыхаў)

Беларуская народнасць утварылася ў выніку змешвання славянскіх каланістаў з балцкім этнічным субстратам



Абгрунтаванне:

- археалагічнае;
- гісторыка-лінгвістычнае;
- культуралагічнае;
- антрапалагічнае;

# Канцэпцыі паходжання назвы “Белая Русь”

- Рамантычныя і “кабінетныя”
- Навуковыя

# Рамантычныя канцэпцыі

- Колер валасоў і вачэй
- Колер адзення
- Прыродныя асаблівасці (чыстыя азёры etc.)

# Навуковыя канцэпцыі

- Незахопленыя манголамі тэрыторыі
- Сувязь з разуменнем накірункаў свету
- Сувязь з веравызнаннем



## IX – X стст.

| | |
|---|---|
| Русь | Нарманы, служылыя скандынавы, купцы |

## X ст.

| | |
|---|---|
| “Руская вера” | Хрысціянства, першымі носбітамі якога былі варагі і русы |

## Канец X – XI стст.

| | |
|---|---|
| “Рускія людзі”, “Руская зямля” | Пасля распаўсюду хрысціянсва тэрмін сталі ўжываць да ўсяго насельніцтва рэгіёну |

## Канец XV – XVI стст.

| | |
|---|---|
| “Белая Русь” | Землі ВКМ, Вялікага Ноўгараду, дзе спавядалі толькі праваслаўе,  і не было каталіцтва |

## 1596 г. – XVIII ст.

| | |
|---|---|
| “Беларусцы”, “беларуская вера” | Праваслаўнае насельніцтва І РП, праваслаўе ў супрацьвагу рыма- і грэка-каталіцтву |